**Пацыенка А.М.**, *дацэнт*

# ВІЛЕНСКІ МУЗЕЙ СТАРАЖЫТНАСЦІ ЯК ЦЭНТР ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У красавіку гэтага года споўнілася сто сорак год з дня адкрыцця Віленскага музея старажытнасці, над стварэннем якога шмат папрацавалі нашы землякі Тышкевічы. Старажытны графскі род Тышкевічаў вядомы на Беларусі з XVI стагоддзя. Ім належаў горад Лагойск Мінскай вобласці. Тут у 1756 г. нарадзіўся Пій Тышкевіч. Гэта быў таленавіты, цікавы чалавек. Ён шмат зрабіў дзеля памнажэння культурнай спадчыны свайго горада: папаўняў кнігамі і карцінамі бібліятэку і мастацкую галерэю, быў добрым музыкам, арганізоўваў канцэрты, лічыўся выдатным рэзчыкам па дрэву і адмысловым інкрустатарам. У яго сядзібе быў вялікі збор карцін заходняга жывапісу, этрускіх ваз, старадаўніх рукапісаў і карт, медалёў, старажытных крыжоў, кальчуг, шчытоў, мячоў, коп'яў, бердышоў і г.д.

Справу бацькі працягвалі два яго сыны - Канстанцін і Яўстафій. Добры знаўца гісторыі роднага краю П.Ф.Тышкевіч

вучыў гэтаму і сваіх дзяцей. Першай школай гістарычнага выхавання былі апавяданні бацькі. Калі хлопцы сталі падлеткамі, яны пачалі займацца даследаваннем курганоў на Лагойшчыне. Асабліва вызначаўся тут Яўстафій. Пачынаючы з 1837 г., ён кожнае лета даследаваў курганы на Лагойшчыне, Барысаўшчыне, Міншчыне, у Друцку, Лідзе, Крэве, Міры і інш. Вялікую дапамогу аказваў яму Канстанцін. Браты, а часам і бацька бралі ў рукі рыдлёўкі і з дапамогай навакольных сялян раскопвалі старажытныя курганы, могільнікі і іншыя помнікі археалогіі. Імі былі даследаваны сотні курганоў. Акрамя археалогіі, браты займаліся этнаграфіяй і фальклорам. Яны хадзілі па вясковых хатах, слухалі і запісвалі народныя песні, легенды, паданні, удзельнічалі ў абрадах. Яны сабралі калекцыю унікальных старажытных рукапісаў і археалагічных матэрыялаў. Вынікі сваіх даследаванняў браты выдавалі ў друку. Канстанцін рэгулярна друкаваўся ў польскім штотыднёвіку «Сябра народаў» і ў газеце «Новое время», якая выходзіла ў Пецярбургу. У 1859 г. выйшла яго кніга «Гістарычныя звесткі пра старажытныя замкі, гарадзішчы і курганы ў Літве і Літоўскай Русі», а ў 1871 г. - краязнаўчая манаграфія «Вілія і яе берагі».

Яўстафій выдаў кнігі «Погляд на крыніцы мясцовай археалогіі, або Апісанне некаторых помнікаў старажытнасці ў Заходніх губернiях Рускай дзяржавы», «Лісты пра Швецыю», «Апісанне Барысаўскага павета...», «Археалогія ў Літве», «Узоры хатняга сумеснага жыцця ў Літве» і інш. У выніку іх працы ў 1842 г. быў створаны Лагойскі археалагічны музей.

У 1845 г. частку сваёй лагойскай калекцыі Я.Тышкевіч перавёз у Вільню і заснаваў там прыватны музей. Яўстафій Піевіч падае прашэнне аб адкрыцці такога музея і археалагічнай камісіі. У 1855 г. ён атрымлівае дазвол і 17 красавіка 1856 г. у памяшканні былога Віленскага універсітэта музей быў адкрыты.

Папячыцелем музея і старшынёй археалагічнай камісіі быў прызначаны Я.Тышкевіч. Пры музеі былі створаны кабінеты: мінералагічны, заалагічны, батанічны і этнаграфічны. У 1858 і 1860 гадах музей наведваў цар Аляксандр Мікалаевіч. Усе расходы па рабоце музея аплачваліся Я.Тышкевічам і членамі

археалагічнай камісіі. Толькі ў 1862 г. дзяржава стала выдзяляць на ўтрыманне музея па 1 тысячы рублёў у год.

Вялікую дапамогу ў рабоце музея і архелагічнай камісіі Я.П.Тышкевічу аказвалі бацька і брат. У 1856 г. П.Ф.Тышкевіч у стогадовым узросце быў выбраны ганаровым членам Віленскай археалагічнай камісіі. Брат Канстанцін Піевіч стаў членам Маскоўскай навуковай археалагічнай камісіі. Навуковая грамадскасць, прызнаючы заслугі Яўстафія Піегіча ў развіцці археалогіі, абрала яго ганаровым членам Пецярбургскай акадэміі навук, членам Дацкага таварыства аматараў паўночных старажытнасцей, Стакгольмскай Каралеўскай акадэміі выяўленчага мастацтва і старажытнасцей, Лонданскага археалагічнага інстытута.

Пасля падаўлення вызваленчага паўстання 1863-1864 гг. Віленскі музей старажытнасці, як адзін з цэнтраў патрыятычнага выхавання ліцвінаў, забаранілі. Была створана спецыяльная камісія, якая канфіскавала ўсе экспанаты, што напаміналі аб гісторыі краю. Гэта былі кнігі, партрэты, бюсты, барэльефы, зброя і іншыя рэчы польскіх каралёў і князёў Вялікага княства Літоўскага, вяльможных прадстаўнікоў рэлігіі, вучоных і дзеячаў культуры. Канфіскаваныя экспанаты былі вывезены ў Маскву. Археалагічная камісія распалася. Я.П.Тышкевіч, вызвалены ад усіх пасад, абражаны і зняважаны, у 1865 г. пакінуў Вільню і пераехаў у Лагойск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ